КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
________________ А.В.Макоўчык
__________________ 20__г.
Рэгістрацыйны № УД- _______/ вуч.
26-2 N 51 2019

# КРАЯЗНАЎСТВА І ЭТНАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ

вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на базе тыпавой вучэбнай праграмы «Краязнаўства і этналогія Беларусі» № ТД-А.600/тып, зацверджанай 29.07.2016.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Д.У.Дубінін, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.М.Люты, прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў і гісторыі Беларусі «Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка», доктар гістарычных навук, прафесар

Л.У.Калядзінскі, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі
(пратакол № 12 ад 31.05. 2019 г. )

Загадчык кафедры А.А.Корзюк

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 18.06.2019).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П. Сяткоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________________ А.В.Макоўчык
___________________ 20__ г.
Рэгістрацыйны № УД- _______/ вуч.

# КРАЯЗНАЎСТВА І ЭТНАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ

вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на базе тыпавой вучэбнай праграмы «Краязнаўства і этналогія Беларусі» № ТД-А.600/тып, зацверджанай 29.07.2016.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Д.У.Дубінін, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.М.Люты, прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў і гісторыі Беларусі «Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка», доктар гістарычных навук, прафесар

Л.У.Калядзінскі, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай усеагульнай гісторыі і метадыкі выкладання гісторыі
(пратакол № 12 ад 31.05. 2019 г. )

Загадчык кафедры А.А.Корзюк

Навукова-метадычным саветом установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № ___ ад ____________).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела Г.В.Вінаградава

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Краязнаўства і этналогія Беларусі» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны».

Засваенне зместу вучэбнай дысцыпліны забяспечвае падрыхтоўку кваліфікаванага выкладчыка гісторыі, які глыбока ведае этналогію і гісторыка-культурную спадчыну сваёй мясцовасці; этнічныя асаблівасці беларускага народа, традыцыі і ўмовы яго існавання, механізмы і заканамернасці яго функцыянавання і трансфармацыі; важнасць месца і ролі кожнага народа ў гістарычным развіцці чалавецтва.

Вучэбная дысцыпліна «Краязнаўства і этналогія Беларусі» непасрэдным чынам звязана з методыкай выкладання гісторыі, асновамі музеязнаўства, тэорыяй і практыкай экскурсійна-краязнаўчай работы, археалогіяй Беларусі і г.д. Такім чынам, вялікае значэнне ў вывучэнні краязнаўства і этналогіі Беларусі мае ажыццяўленне міждысцыплінарнага падыходу.

Вучэбная праграма «Краязнаўства і этналогія Беларусі» складаецца з двух раздзелаў. Першы раздзел прысвечаны вывучэнню краязнаўства Беларусі; другі – вывучэнню этналогіі Беларусі. У праграме тэарэтычная і практычная часткі дысцыпліны пададзены разам. Гэта дазваляе выкладчыку самастойна вызначыць, які матэрыял складае аснову тэарэтычнага навучання краязнаўства і этналогіі Беларусі, а які можа стаць базай арганізацыі семінараў са студэнтамі.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны "Краязнаўства і этналогія Беларусі" – засваенне тэарэтычных асноў выкладання вучэбнага прадмета "Краязнаўства і этналогія Беларусі", авалоданне прафесійнымі кампетэнцыямі, неабходнымі будучым настаўнікам для фарміравання фундамента краязнаўчых і этналагічных ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай этналагічнай думкі, для арганізацыі самастойнай краязнаўчай і этнаграфічнай работы ва ўстанове адукацыі.

**Задачы** вучэбнай дысцыпліны:

пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі айчыннымі і замежнымі тэорыямі і даследаваннямі, даступнымі крыніцамі па краязнаўству і этналогіі Беларусі;

вызначыць спецыфіку фарміравання і сучаснага развіцця этнічнага саставу Беларусі, самасвядомасці і стэрэатыпаў міжэтнічных адносін; суадносіны ўплыву ўнутраных і глабальных фактараў на развіццё этнічных працэсаў Беларусі;

пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі метадамі пошуку краязнаўчай інфармацыі і этнаграфічнай спадчыны беларусаў;

паказаць найбольш эфектыўныя метады арганізацыі краязнаўчай работы ў школе;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сфарміраваць навыкі і ўменні збераджэння і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны ў адукацыйным працэсе школы.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

**Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый**

Студэнт павінен:

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.
- АК-2. Валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследавання.
- АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.
- АК-4. Умець працаваць самастойна.
- АК-5. Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).
- АК-6. Валодаць междысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.
- АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і працай з камптутарам.
- АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.
- АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый**

Студэнт павінен:

- САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.
- САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.
- САК-6. Умець працаваць у камандзе.

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый**

Студэнт павінен быць здольны:

**Навучальная дзейнасць**

- ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.
- ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.
- ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.
- ПК-4. Арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў.

**Каштоўнасна-арыентацыйная дзейнасць**

- ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

- месца і роль гістарычнага краязнаўства ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін;
- асноўныя крыніцы і метады гістарычнага краязнаўства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- метады этналагічных даследаванняў;
- этнагенез беларусаў, іх традыцыйную, матэрыяльную і духоўную культуру і быт;
- этнічныя меньшасці Беларусі, іх традыцыйную культуру і быт.

*умець:*

- выяўляць і выкарыстоўваць асноўныя крыніцы краязнаўчых даследаванняў;
- выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял у вучэбнай і ў пазакласнай рабоце;
- выкарыстоўваць у навукова-даследчай рабоце разнастайныя метады этналагічных даследаванняў;
- падрыхтаваць і правесці гісторыка-краязнаўчую экскурсію;
- арганізаваць школьны краязнаўчы гурток;
- выяўляць, фіксаваць і апісваць этнаграфічныя помнікі;

*валодаць:*

- краязнаўчым матэрыялам, дадзенымі этналогіі Беларусі;
- метадамі этналагічных даследаванняў;
- навыкамі арганізацыі краязнаўчай работы ва ўстанове адукацыі;
- уменнямі весці навуковую краязнаўчую работу;
- практычнымі ўменнямі выкарыстання ведаў і практычных навыкаў у галіне этналогіі пры вывучэнні айчыннай гісторыі;

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны вучэбнам планам адводзіцца ўсяго 159 гадзін, з іх 72 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 34 гадзіны – лекцыйныя, 38 гадзін – семінарскія.

На самастойную работу студэнта адводзіцца 87 гадзін, з іх 36 гадзін - экзамен

На завочнай форме атрымання адукацыі на вывучэнне дысцыпліны па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны вучэбнам планам адводзіцца усяго 159 гадзін, з іх 18 – аўдыторных гадзін (лекцыйных – 8, семінарскіх заняткаў – 10 гадзін), на самастойную работу – 105 гадзін, з іх 36 гадзін – экзамен Форма кантроля – экзамен на 1 курсе, залік на 2 курсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Краязнаўства Беларусі

### Тэма 1.1 Прадмет і задачы краязнаўства Беларусі

Паняцце «гістарычнае краязнаўства». Месца гістарычнага краязнаўства ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін. Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы памятнікаў гісторыі і культуры. Асноўныя крыніцы і метады краязнаўчых даследаванняў.

### Тэма 1.2. Развіццё гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях

Старажытнейшыя крыніцы гістарычнага краязнаўства на Беларусі. Летапісы і хронікі, актавы матэрыял, заканадаўчыя помнікі, гаспадарчыя дакументы, дзённікі, успаміны, літаратурна-публіцыстычныя творы. Збіральніцкая дзейнасць Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Агінскіх, Тызенгаўза.

Гістарычнае краязнаўства XIX – пачатку XX ст. Першыя спробы навуковага вывучэння Беларусі. Беларускае вольнае эканамічнае таварыства. Краязнаўчая дзейнасць З.Даленга-Хадакоўскага, Т.Нарбута, братоў Тышкевічаў, А.Кіркора.Дзейнасць Віленскіх археаграфічнай і археалагічнай камісій, Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, Мінскага царкоўнага гісторыка-эканамічнага камітэта і інш. Выданне зборнікаў дакументаў і матэрыялаў «Витебская старина», «Минская старина» і інш. Краязнаўчы матэрыял у перыядычным друку. А.М. Семянтоўскі, Ю.Ф. Крачкоўскі, А.П. Сапуноў, Е.Р. Раманаў, Л.І. Даўгяла і інш.

Гістарычнае краязнаўства ў савецкі час. Краязнаўства і палітыка беларусізацыі. Інстытут беларускай культуры. Цэнтральнае бюро краязнаўства. Першая Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя, Першы і Другі Усебеларускія краязнаўчыя з’езды. Часопіс «Наш край». Краязнаўства ў школе. Заснаванне краязнаўчых музеяў. Краязнаўства ў Заходняй Беларусі. Згортванне краязнаўчай работы ў 30-я гг. Краязнаўчая работа ў пасляваенныя гады. Школьнае і турысцкае краязнаўства, пошуковая праца. Увядзенне краязнаўства ў праграму ВНУ. Дзейнасць Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага фонда культуры, Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны і інш. Аднаўленне работы Беларускага краязнаўчага таварыства. Характарыстыка бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», часопіса «Спадчына», шматтомнай серыі кніг «Памяць».

### Тэма 1.3. Гісторыка-культурная спадчына, яе ахова і выкарыстанне

Паняцце «гісторыка-культурная спадчына». Ахова помнікаў гісторыі і культуры ў XIX--пачатку XX ст. Будаўнічы статут, Інструкцыі археалагічных камісій, абмеркаванне пытанняў аховы помнікаў на археалагічных з’ездах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзейнасць губернскіх вучоных архіўных камісій, губернскіх статыстычных камітэтаў.

Першыя пастановы органаў савецкай улады па ахове помнікаў. Арганізацыя музеяў. Стан захаванасці помнікаў гісторыі і культуры ў 20-30-я гады. Ахова помнікаў у пасляваенныя гады. Дзейнасць грамадскасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Выданне краязнаўчай літаратуры. «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Дзяржаўная інспекцыя. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне. Ахоўныя абавязацельствы. Ахоўныя зоны. Кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў.

**Тэма 1.4. Методыка выкарыстання краязнаўчых матэрыялаў у адукацыйным працэсе**

Краязнаўства ў вучэбнай і пазакласнай рабоце. Праграма для базавай і сярэдняй школы і гістарычнае краязнаўства. Сувязі праграмнага і непраграмнага краязнаўства. Краязнаўчы матэрыял на ўроках гісторыі. Правядзенне ўрокаў-экскурсій і іншых урокаў, поўнасцю заснаваных на выкарыстанні краязнаўчага матэрыялу. Збіранне і назапашванне настаўнікамі гісторыі краязнаўчага матэрыялу. Факультатыўныя заняткі па краязнаўству. Формы іх правядзення.

Асноўныя формы пазакласнай гісторыка-краязнаўчай работы ў школе. Масавая, групавая і індывідуальная работа па краязнаўству і іх узаемасувязь. Гурток як асноўная форма арганізацыі пазакласнай краязнаўчай работы. Планаванне, састаў і змест працы гуртка. Экскурсіі, экспедыцыі і паходы па родным краі, іх падрыхтоўка, правядзенне, афармленне матэрыялаў, падвядзенне вынікаў. Грамадска-карысная праца ў час паходаў і экспедыцый. Гісторыка-краязнаўчыя вечары, канферэнцыі, алімпіяды, віктарыны, выстаўкі. Выпуск газет, бюлетэняў, напісанне рэфератаў.

Гісторыка-краязнаўчая экскурсія, яе падрыхтоўка і правядзенне. Экскурсіі агульныя і тэматычныя. Формы арганізацыі экскурсіі. Асаблівасці экскурсій у залежнасці ад уключанасці ў вучэбны працэс. Галоўныя этапы падрыхтоўкі экскурсіі: вызначэнне мэты і тэмы экскурсіі, збор матэрыяла, адбор і вывучэнне экскурсійных аб’ектаў, распрацоўка маршрута, падрыхтоўка тэкста і метадычнай распрацоўкі экскурсіі. Метадычныя прыёмы паказа аб’ектаў і расказа. Папярэдні агляд, аналіз, рэканструкцыя, лакалізацыя падзей, параўнанне, дэманстрацыя. Расказ па тэме экскурсіі: ад асобнага да агульнага ці ад агульнага да асобнага. Праблемная форма выкладання вуснага матэрыяла. Прыёмы вуснага выкладання матэрыяла: экскурсійная даведка, славесная рэканструкцыя, тлумачэнне, характарыстыка, каменціраванне, гутарка. Тэхніка правядзення экскурсіі. Асноўныя патрабаванні да экскурсавода.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Школьныя музеі і іх профілі. Савет музея, збор, улік і захаванне матэрыялаў музеяў. Экспазіцыя школьнага музея. Выкарыстанне матэрыялаў школьнага музея ў навучальнай і выхаваўчай рабоце школы.

## Раздзел 2. Этналогія Беларусі

### Тэма 2.1. Уводзіны

Прадмет і задачы этналогіі. Паняцці “быт”, “культура”, “этнас”, “этнічная тэрыторыя”. Іх адзнакі. Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў. Этнаграфічныя веды як фактар нацыянальнай свядомасці і жыццяздольнасці беларускага народа.

Віды крыніц этналогіі. Пісьмовыя крыніцы. Летапісы. Хронікі. Запісы паслоў і падарожнікаў. Мемуары. Актавыя дакументы.

Палявыя даследаванні. Фіксацыя звестак. Палявы сшытак і дзённік. Пашпартызацыя этнаграфічных матэрыялаў. Стацыянарны і экспедыцыйны метады. Сацыялагічны метад. Выяўленчыя матэрыялы. Малюнкі. Барэльефы. Скульптура.

Архіўныя і музейныя зборы.

Выкарыстанне матэрыялаў лінгвістыкі, археалогіі, антрапалогіі, фальклору.

Масавыя крыніцы (пісьмовыя і рэчавыя). Выкарыстанне этнаграфічных ведаў у сучасным грамадстве.

Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная).

Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. Эвалюцыйны кірунак. Л. Г. Морган. Дыфузіяніскі кірунак. Ф. Грэбнеў. Псіхалагічная канцэпцыя ў этнаграфіі. Рэлятывізм. Неаэвалюцыяністы.

### Тэма 2.2. Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі

Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі. Уплыў Рускага геаграфічнага таварыства на развіццё этнаграфічных даследаванняў. Этнаграфічныя працы Я. Чачота, У. Сыракомлі, З. Хадакоўскага, Я. Тышкевіча, Ю. Крашэўскага, А. Рыпінскага, Л. Галембёўскага. Іх характар.

Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст. Дзейнасць П. Шпілеўскага, П. Бяссонава, У. Насовіча. Этнаграфічныя экспедыцыі С. Максімава, П. Чубінскага. Утварэнне Паўночна-Заходняга аддзела РГТ. Збор і друкаванне этнаграфічных матэрыялаў П. Шэйнам, М. Нікіфароўскім, Е. Раманавым, У. Дабравольскім. Этнаграфічная дзейнасць М. Янчука, М. Доўнар-Запольскага, А. Багдановіча. Вывучэнне гісторыі беларускай этнаграфіі А. Цыпіным. Вывучэнне быту і традыцыйнай культуры сялян М. Федароўскім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Навуковая дзейнасць А. Сержпутоўскага, У. Сербава. Уклад Я. Карскага ў беларускую этнаграфію.

Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час. Стварэнне навуковых устаноў па вывучэнні народнай культуры. Беларускае вольна-эканамічнае таварыства. Беларускі народны ўніверсітэт. Навукова-тэрміналагічная камісія. Інстытут беларускай культуры. Першыя спробы стварэння марксісцкай гістарыяграфіі беларускай этнаграфіі (1920-я — пачатак 30-х гг. XX ст.).

Распрацоўка гісторыі беларускай этнаграфіі А. Шлюбскім. Згортванне этнаграфічных даследаванняў у 1938—1940 гг. «Выкрывальніцкія» артыкулы і брашуры А. Бабровіча, І. Шпілеўскага, М. Грынблата, М. Нікольскага.

Страты этнаграфічных матэрыялаў, навуковых рукапісаў, калекцый этнаграфічных прадметаў у час вайны.

Аднаўленне навуковага цэнтра па вывучэнні беларускай этнаграфіі пасля вызвалення рэспублікі. Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг. Стварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Распрацоўка праблематыкі сучаснай беларускай этналогіі. Даследаванне этнагенезу і этнічнай гісторыі, праблем традыцыйнай гаспадаркі і матэрыяльнай культуры, грамадскага і сямейнага быту, традыцыйнай духоўнай культуры. Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст.

**Тэма 2.3. Этнічная гісторыя Беларусі**

Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку. Змена этнічнага складу насельніцтва ў эпоху бронзы.

Передумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. Асіміляцыя мясцовага даславянскага насельніцтва і фарміраванне першапачатковых усходнеславянскіх этнічных супольнасцей: дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў. Значэнне ўтварэння старажытных дзяржаў у фарміраванні народнасцей. Тэрыторыя сучаснай Беларусі ў агульнаўсходнеславянскі перыяд. “Палешукі” і “беларусцы”. Утварэнне беларускай мовы, яе дыялекту. Фарміраванне тэрыторыі Беларусі ў познім сярэднявеччы.

Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў: велікаруская, велікапольская, старажытнаруская, крывіцкая, крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая, балцкая, фіна-угорская, эвалюцыйна-дыфузійная.

Этнічнае развіццё беларускага народа. З’яўленне на беларускіх землях пасяленняў яўрэяў, татараў, рускіх, палякаў, літоўцаў, латышоў і інш. Становішча, заняткі гэтых нацыянальных супольнасцей і іх узаемаадносіны з мясцовым беларускім насельніцтвам. Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст. Міжэтнічныя адносіны на сучасным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

этапе. Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў. Беларуская дыяспара. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны.

**Тэма 2.4. Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў**

Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства. Сістэмы земляробства. Тыпы традыцыйных ворыўных прылад. Прылады баранавання і сяяння. Асноўныя прылады для ўборкі збожжавых культур, малацьбы і веяння. Захоўванне збожжа і бульбы. Традыцыйныя прылады апрацоўкі збожжа, ільну і каноплі. Традыцыйная ежа. З’яўленне новых прадуктаў харчавання.

Прамысловыя і рамесныя заняткі. Здабываючыя промыслы (збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, пчалярства, лясныя і лесахімічныя промыслы) і рамёствы (ткацтва, вышыўка, кавальства, дрэваапрацоўка, ганчарства, пляценне, скураныя рамёствы і інш.). Іх роля і месца ў быце беларусаў.

Традыцыйнае адзенне. Тыпалогія адзення. Матэрыялы. Асноўныя спосабы ўпрыгожвання. Мужчынскае адзенне. Тыповы комплекс. Верхняе адзенне сялян і шляхты. Жаночае адзенне. Адметнасці жаночай вопраткі. Тыповы жаночы комплекс.

Галаўныя ўборы. Мужчынскія і жаночыя галаўныя ўборы. Тыпалагічныя асаблівасці.

Абутак. Класіфікацыя абутку паводле матэрыялу, канструкцый, сезона года, бытавой сітуацыі.

Этнічныя асаблівасці адзення. Лакальныя адрозненні.

**Тэма 2.5. Беларускае народнае жыллё**

Арганізацыя жылога асяродка. Функцыі жылля. Эвалюцыя жылля, яго сацыяльныя і культурна-бытавыя асаблівасці. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.

Сядзіба (двор) і сядзібныя пабудовы. Жылыя, падсобныя, гаспадарчыя і прамысловыя памяшканні. Жыллёва-бытавы комплекс. Функцыі і канструкцыйныя асаблівасці кожнай з пабудоў; геаграфія распаўсюджвання, рэгіянальныя і сацыяльныя рысы. Размяшчэнне, тыпы сядзібнай забудовы (тыпы двара): замкнуты (вяночны, круглы), двухрадны, трохрадны, крыты, пагонны, г-падобны, рассеяны (свабодны, з незвязанымі пабудовамі). Забудовы. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сядзібнай забудовы.

Інтэр’ер жылля. Інтэр’ер як унутраная прастора, функцыянальна і эстэтычна арганізаваная.

Інтэр’ер курнай хаты (да 60-х гг. XIX ст.). Структурныя часткі: курная печ, верхнік (душнік, дымнік); спальны пол, палаці, полаг; падлога і столя; лавы, грады; красны кут (покуць), бажніца, стол, зэдаль; “бабін кут”, гаспадарчы ўслон, кухонная паліца. Традыцыйная мэбля, посуд і бытавыя рэчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асвятленне хаты: лучнікі, светач, каганец. Агонь у светаўяўленнях, звычаях, абрадах. “Жаніцьба коміна”.

Інтэр’ер гарадскога і шляхецкага жылля. Змены ў інтэр’еры народнага жылля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Традыцыйныя элементы ў інтэр’еры сучаснага жылля.

Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.

Драўлянае дойлідства – адно з самых распаўсюджаных і прыярытэтных рамёстваў у Беларусі. Асноўныя інструменты. Будаўнічыя канструкцыі: каркасная (слупавая) і зрубная. Фундамент (штандары, палі, падмурак, прызба). Дахі, іх форма і канструкцыя: зрубная (закотам і стажковая), каркасная (на сохах і кроквах). Пакрыццё стрэх. Дэкор у народным дойлідстве. Культавыя пабудовы – увасабленне лепшых традыцый народнага дойлідства.

Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і.

**Тэма 2.6. Беларуская кухня**

Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя.

Хлеб у традыцыйна-бытавой культуры беларусаў. Віды і сарты хлеба. Хлебныя вырабы: ляпні, перапечкі, сачні, варэнікі і пампушкі, праснакі, каржы, пернікі, крэндзелі, абаранкі, хрусты. Абрадавыя печывы. Бліны і аладкі. Мучныя стравы. Аўсяныя мучныя стравы. Крупяныя стравы.

Бульба і гародніна. Малако і малочныя прадукты. Мясная ежа. Рыба і рыбныя стравы. Пітво. Класіфікацыя напіткаў.

З’яўленне новых прадуктаў харчавання.

**Тэма 2.7. Сям’я**

Формы сям’і. Асноўныя функцыі сям’і. Рэгламентацыя ўнутрысямейных адносін. Становішча жанчыны ў беларускай сям’і. Колькасны састаў сем’яў. Роля сямейнай традыцыі як сродку перадачы, захавання і замацавання міжпакаленнай этнакультурнай інфармацыі.

Шлюб. Шлюбны ўзрост. Маёмасныя адносіны пры заключэнні шлюбу. Прымацтва. Стабільнасць шлюбу. Скасаванне шлюбу. Вясельная абраднасць. Сватанне. Заручыны. Суборная субота. Вяселле. Вясельныя чыны. Каравайны звычай. Царкоўны абрад вянчання. Увядзенне нявесты ў хату жаніха. Абрадавыя дзеянні, накіраваныя на праверку працоўных здольнасцей нявесты і яе характару. Паслявясельныя звычаі і абрады. Лакальныя асаблівасці беларускай вясельнай абраднасці.

Радзіны. Радзіныя звычаі і абрады.

Пахавальна-памінальная абраднасць. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Этнаканфесійныя і рэлігійныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.

Сучасная сітуацыйная абраднасць у Беларусі. Міжэтнічныя шлюбы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 2.8. Традыцыйная духоўная культура**

Вераванні народаў Беларусі. Міфалагічныя вобразы традыцыйнай народнай рэлігіі.

Магічныя абрады. Гаспадарчая, лячэбная, любоўная і шкоданосная магія. Замовы.

Вусная народная творчасць. Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай свядомасці беларусаў. Беларускія народныя песні.

Беларускі народны каляндар. Каляндарна-абрадавая паэзія. Пазаабрадавая паэзія. Частушкі.

Казкі. Сацыяльна-бытавыя і народныя казкі. Казкі пра жывёл, іх ідэйны змест.

Неказачная проза. Легенды, паданні, прыкметы, павер'і.

Анекдоты, жарты, досціпы.

Народная музыка. Характэрныя рысы народнай вакальнай творчасці. Народная інструментальная музыка. Народныя інструментальныя ансамблі.

Народнае харэаграфічнае майстэрства. Карагоды. Традыцыйныя народныя танцы. Распаўсюджванне новых бытавых танцаў.

Народны тэатр. Батлейка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ДЗЁННАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва радзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная (пазааўдыторная работа) | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Кіруемая самастойная работа самастойная работа | | | | |
| 1 семестр | | | | | | | | |
| 1. | **Раздзел 1. Краязнаўства Беларусі** | **18** | **18-** | | **26** | | | |
| 1.1. | **Прадмет і задачы краязнаўства Беларусі**<br>Паняцце «гістарычнае краязнаўства». Месца гістарычнага краязнаўства ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін. Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы памятнікаў гісторыі і культуры.<br>Асноўныя крыніцы і метады краязнаўчых даследаванняў. | 4 | 4 | | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 3; 5;] | Апытванне Рэфераты |
| 1.2. | **Развіццё гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях**<br>Старажытнейшыя крыніцы гістарычнага краязнаўства на Беларусі.<br>Гістарычнае краязнаўства XIX – пачатку XX ст.<br>Гістарычнае краязнаўства ў савецкі час.<br>Характарыстыка бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», часопіса «Спадчына», шматтомнай серыі кніг «Памяць». | 4 | 4 | | 8 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;3;5;] | Апытванне, даклады |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3 | **Гісторыка-культурная спадчына, яе ахова і выкарыстанне**<br><br>Паняцце «гісторыка-культурная спадчына». Ахова помнікаў гісторыі і культуры ў XIX--пачатку XX ст.<br>Ахова помнікаў у пасляваенныя гады. Дзейнасць грамадскасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.<br>Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне. Ахоўныя абавязацельствы. Ахоўныя зоны. Кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў. | 4 | 6 | | 8 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;3;4, 5; 7,8] | Апытванне |
| 1.4 | **Методыка выкарыстання краязнаўчых матэрыялаў у адукацыйным працэсе**<br><br>Краязнаўства ў вучэбнай і пазакласнай рабоце. Краязнаўчы матэрыял на ўроках гісторыі.<br>Збіранне і назапашванне настаўнікамі гісторыі краязнаўчага матэрыялу. Факультатыўныя заняткі па краязнаўству. Формы іх правядзення.<br>Асноўныя формы пазакласнай гісторыка-краязнаўчай работы ў школе.<br>Гісторыка-краязнаўчая экскурсія, яе падрыхтоўка і правядзенне.<br>Школьныя музеі і іх профілі. Савет музея, збор, улік і захаванне матэрыялаў музеяў. | 6 | 4 | | 6 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [3;4; 5;7] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |
| 2 | **Раздзел 2. Этналогія Беларусі** | **16** | **20** | | **25** | | | |
| 2.1 | **Уводзіны**<br>Прадмет і задачы этналогіі.<br>Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў.<br>Віды крыніц этналогіі. | 2 | | | 1 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;2;6;9] | Апытванне Рэфераты |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная). Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. | | | | | | | |
| 2.2. | **Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі**<br>Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст.<br>Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час.<br>Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг.<br>Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст. | 2 | 4 | | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 4; 9] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| 2.3 | **Этнічная гісторыя Беларусі**<br>Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку.<br>Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы.<br>Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў<br>Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст.<br>Міжэтнічныя адносіны на сучасным этапе. Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў. | 2 | 2 | 4 | | Мультымедыя, вучэбная літаратура | 1; 2; 4; 9] | Апытванне Рэфераты |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.4 | **Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў**<br>Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства. Прамысловыя і рамесныя заняткі.<br>Здабываючыя промыслы.<br>Традыцыйнае адзенне. | 2 | 6 | | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;2;5; 6; 7,8,9] | Апытванне Рэфераты |
| 2.5 | **Беларускае народнае жыллё**<br>Эвалюцыя жылля, яго сацыяльныя і культурна-бытавыя асаблівасці. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.<br>Інтэр’ер гарадскога і шляхецкага жылля. Змены ў інтэр’еры народнага жылля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Традыцыйныя элементы ў інтэр’еры сучаснага жылля.<br>Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.<br>Будаўнічыя звычаі, абрады, павер’і. | 2 | 2 | | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 4; 5;6;7,8,] | Апытванне Рэфераты |
| 2.6 | **Беларуская кухня**<br>Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя. | 2 | 2 | | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 3 5; 7,9] | Апытванне Рэфераты |
| 2.7 | **Сям’я**<br>Формы сям’і. Асноўныя функцыі сям’і. Рэгламентацыя ўнутрысямейных адносін.<br>Вясельная абраднасць.<br>Радзіны. Радзіныя звычаі і абрады.<br>Пахавальна-памінальная абраднасць. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Этнаканфесійныя і рэлігійныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.<br>Сучасная сітуацыйная абраднасць у Беларусі. Міжэтнічныя шлюбыГермания в X – XIII вв. | 2 | 2 | | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;2;4; 5; 6; 7,9] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.8 | **Традыцыйная духоўная культура**<br>Вераванні народаў Беларусі.<br>Магічныя абрады. Гаспадарчая, лячэбная, любоўная і шкоданосная магія. Замовы.<br>Вусная народная творчасць.<br>Беларускі народны каляндар.<br>Анекдоты, жарты, досціпы.<br>Народная музыка.<br>Народнае харэаграфічнае майстэрства.<br>Народны тэатр. Батлейка. | 2 | 2 | 2 | 4 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 5; 6; 7,8,9] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 3 |
| | Усяго гадзін | **34** | **38** | | **51** | | | **Экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

| , тэмы | Назва радзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная (пазааўдыторная работа | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Форма ккантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Кіруемая самастойная работа самостоятельная работа | | | | |
| 1 семестр | | | | | | | | |
| 1. | **Раздзел 1. Краязнаўства Беларусі** | **4** | **6-** | | **30** | | | |
| 1.1. | **Прадмет і задачы краязнаўства Беларусі**<br><br>Паняцце «гістарычнае краязнаўства». Месца гістарычнага краязнаўства ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін. Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы памятнікаў гісторыі і культуры.<br>Асноўныя крыніцы і метады краязнаўчых даследаванняў.. | 2 | | | | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 3; 5;] | Рэфераты |
| 1.2. | **Развіццё гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях**<br><br>Старажытнейшыя крыніцы гістарычнага краязнаўства на Беларусі.<br>Гістарычнае краязнаўства XIX – пачатку XX ст.<br>Гістарычнае краязнаўства ў савецкі час.<br>Характарыстыка бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», часопіса «Спадчына», шматтомнай серыі кніг «Памяць». | | 2 | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;3;5;] | гутарка, Апытванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3 | **Гісторыка-культурная спадчына, яе ахова і выкарыстанне**<br><br>Паняцце «гісторыка-культурная спадчына». Ахова помнікаў гісторыі і культуры ў XIX--пачатку XX ст.<br>Ахова помнікаў у пасляваенныя гады. Дзейнасць грамадскасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.<br>Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне. Ахоўныя абавязацельствы. Ахоўныя зоны. Кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў. | | 2 | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;3;4, 5; 7,8] | Апытванне гутарка |
| 1.4 | **Методыка выкарыстання краязнаўчых матэрыялаў у адукацыйным працэсе**<br>Краязнаўства ў вучэбнай і пазакласнай рабоце. Краязнаўчы матэрыял на ўроках гісторыі.<br>Збіранне і назапашванне настаўнікамі гісторыі краязнаўчага матэрыялу. Факультатыўныя заняткі па краязнаўству. Формы іх правядзення.<br>Асноўныя формы пазакласнай гісторыка-краязнаўчай работы ў школе.<br>Гісторыка-краязнаўчая экскурсія, яе падрыхтоўка і правядзенне.<br>Школьныя музеі і іх профілі. Савет музея, збор, улік і захаванне матэрыялаў музеяў. | | 2 | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [3;4; 5;7] | Апытванне Рэфераты |
| 2 | **Раздзел 2. Этналогія Беларусі** | 4 | 4 | | 75 | | | Апытванне Рэфераты |
| 2.1 | **Уводзіны**<br>Прадмет і задачы этналогіі.<br>Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў.<br>Віды крыніц этналогіі.<br>Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, | 2 | | | | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;2;6;9] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная). Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. | | | | | | | |
| 2.2. | **Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі**<br>Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст.<br>Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час.<br>Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг.<br>Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст. | | | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 4; 9] | Рэфераты Вусныя даклады |
| 2.3 | **Этнічная гісторыя Беларусі**<br>Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку.<br>Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы.<br>Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў.<br>Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст.<br>Міжэтнічныя адносіны на сучасным этапе. Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў. | 2 | | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | 1; 2; 4; 9] | Рэфераты |
| 2.4 | **Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў**<br>Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства.<br>Прамысловыя і рамесныя заняткі.<br>Здабываючыя промыслы.<br>Традыцыйнае адзенне. | | 2 | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;2;5; 6; 7,8,9] | Апытванне Рэфераты |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.5 | **Беларускае народнае жыллё**<br>Эвалюцыя жылля, яго сацыяльныя і культурна-бытавыя асаблівасці. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.<br>Інтэр'ер гарадскога і шляхецкага жылля. Змены ў інтэр'еры народнага жылля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Традыцыйныя элементы ў інтэр'еры сучаснага жылля.<br>Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.<br>Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і.. | | | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 4; 5;6;7,8,] | Рэфераты прэзентацыі |
| 2.6 | **Беларуская кухня**<br>Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя. | | | | 5 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 3 5; 7,9] | Рэфераты |
| 2.7 | **Сям'я**<br>Формы сям'і. Асноўныя функцыі сям'і. Рэгламентацыя ўнутрысямейных адносін.<br>Вясельная абраднасць.<br>Радзіны. Радзіныя звычаі і абрады.<br>Пахавальна-памінальная абраднасць. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Этнаканфесійныя і рэлігійныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.<br>Сучасная сітуацыйная абраднасць у Беларусі. Міжэтнічныя шлюбыГермания в X – XIII вв. | | | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1;2;4; 5; 6; 7,9] | Прэзентацыі ,вусныя даклады |
| 2.8 | **Традыцыйная духоўная культура**<br>Вераванні народаў Беларусі.<br>Магічныя абрады. Гаспадарчая, лячэбная, любоўная і шкоданосная магія. Замовы.<br>Вусная народная творчасць.<br>Беларускі народны каляндар.<br>Анекдоты, жарты, досціпы. | | 2 | | 10 | Мультымедыя, вучэбная літаратура | [1; 2; 5; 6; 7,8,9] | Апытванне Рэфераты |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Народная музыка.<br>Народнае харэаграфічнае майстэрства.<br>Народны тэатр. Батлейка. | | | | | | | |
| | **Усяго гадзін** | **8** | **10** | | **105** | | | **Экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**


1. Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік / І.І. Багдановіч, М.Ф.Бандзелікаў [і інш.]; пад рэд. А.А. Корзюка. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2014. – 220 с.
2. Лурье, С.В. Историческая этнология: учеб. пособие / С.В. Лурье. – М : Академический проект: Гаудеамус, 2004. – 624 с.
3. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэб. дапам./ В.І.Саітава. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с.
4. Садохин, А.П. Этнология: учебник / А.П. Садохин, Т.Г. Грушевицкая. – М : «Академия»; Высшая школа, 2000. – 304 с.
5. Самусік, А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэбн. дапаможнік / А. Ф. Самусік. – Мінск : БДЭУ, 2004. – 209 с.
6. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура: вучэбна-метадычны дапаможнік. – Мінск : Беларусь, 1997. – 207с.
7. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэб. -метад. дапам. / Т.А. Навагродскі [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009.


**Дадатковая**


1. Беларусы: Сучасныя этнакультурныя працэсы / Г.І. Каспяровіч [і інш.]; пад рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 607 с.
2. Котович, О. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук, – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 590 с.
3. Маленка, Л.І. Беларускі народны касцюм / Л.І. Маленка. – Мінск : Ураджай, 2001. – 160 с.
4. Лісаў, А.Г. Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А.Г. Лісаў, А.М. Падліпскі. – Віцебск : УПП “Віцебская абласная друкарня”, 2000. – 46 с.
5. Навагродскі, Т.А. Традыцыі народнага харчавання беларусаў / Т.А. Навагродскі. – Мінск : НІА, 2000. – 112 с.
6. Помнікі этнаграфіі. Методыка выяўлення, апісання і збірання / М.Ф. Піліпенка [і інш.]; пад рэд. В.К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 150 с.
7. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў / Л.В. Ракава. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 311 с.
8. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы ; редкол.: А.Вл. Гурко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – 466 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## РЭКАМЕНДАВАНЫЯ МЕТАДЫ (ТЭХНАЛОГІІ) НАВУЧАННЯ

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адэкватна адпавядаюць мэтам навучання методыкі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Краязнаўства і этналогія Беларусі», з’яўляюцца: камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы і даследчы метады); тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Краязнаўства і этналогія Беларусі”

| № п/п | Назва тэмы | Кол-ць гадзін для СРС | Заданне | Формы выканання |
|---|---|---|---|---|
| | **Раздзел 1. Краязнаўства Беларусі** | | | |
| 1. | **Прадмет і задачы краязнаўства Беларусі** | 4 | Паняцце «гістарычнае краязнаўства». Месца гістарычнага краязнаўства ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін. Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы памятнікаў гісторыі і культуры.<br>Асноўныя крыніцы і метады краязнаўчых даследаванняў.. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 2 | **Развіццё гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях** | 8 | Старажытнейшыя крыніцы гістарычнага краязнаўства на Беларусі.<br>Гістарычнае краязнаўства XIX – пачатку XX ст.<br>Гістарычнае краязнаўства ў савецкі час. Характарыстыка бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», часопіса «Спадчына», шматтомнай серыі кніг «Памяць». | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 3 | **Гісторыка-культурная спадчына, яе ахова і выкарыстанне**<br>. | 8 | Паняцце «гісторыка-культурная спадчына». Ахова помнікаў гісторыі і культуры ў XIX--пачатку XX ст.<br>Ахова помнікаў у пасляваенныя гады. Дзейнасць грамадскасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.<br>Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне. Ахоўныя абавязацельствы. Ахоўныя зоны. Кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 4 | **Методыка выкарыстання краязнаўчых матэрыялаў у адукацыйным працэсе** | 6 | Краязнаўства ў вучэбнай і пазакласнай рабоце. Краязнаўчы матэрыял на ўроках гісторыі. Збіранне і назапашванне настаўнікамі гісторыі краязнаўчага матэрыялу. Факультатыўныя заняткі па краязнаўству. Формы іх правядзення.<br>Асноўныя формы пазакласнай гісторыка-краязнаўчай работы ў школе.<br>Гісторыка-краязнаўчая экскурсія, яе падрыхтоўка і правядзенне.<br>Школьныя музеі і іх профілі. Савет музея, збор, улік і захаванне матэрыялаў музеяў | Гутарка, праверка выкананых заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| . | **Раздзел 2. Этналогія Беларусі** | | | |
| 5 | **Уводзіны** | 1 | Прадмет і задачы этналогіі.<br>Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў.<br>Віды крыніц этналогіі.<br>Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная).<br>Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 6 | **Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі** | 4 | . Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст.<br>Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час.<br>Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг.<br>Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст. | Праца з крыніцамі. |
| 7. | **Этнічная гісторыя Беларусі** | 4 | Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку.<br>Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы.<br>Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў<br>Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст.<br>Міжэтнічныя адносіны на сучасным этапе. Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 8 | **Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў** | 4 | Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства. Прамысловыя і рамесныя заняткі.<br>Здабываючыя промыслы.<br>Традыцыйнае адзенне. | Гутарка, праверка выкананых заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9 | **Беларускае народнае жыллё**<br>.. | 4 | Эвалюцыя жылля, яго сацыяльныя і культурна-бытавыя асаблівасці. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.<br>Інтэр'ер гарадскога і шляхецкага жылля. Змены ў інтэр'еры народнага жылля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Традыцыйныя элементы ў інтэр'еры сучаснага жылля.<br>Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.<br>Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і. | Гутарка, праверка выкананых заданняў. |
| 10 | **Беларуская кухня** | 4 | Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| 11 | **Сям'я** | 4 | Формы сям'і. Асноўныя функцыі сям'і. Рэгламентацыя ўнутрысямейных адносін. Вясельная абраднасць.<br>Радзіны. Радзінныя звычаі і абрады. Пахавальна-памінальная абраднасць. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Этнаканфесійныя і рэлігійныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.<br>Сучасная сітуацыйная абраднасць у Беларусі. Міжэтнічныя шлюбы Германія в X – XIII вв. | Гутарка, праверка выкананых заданняў. |
| | **Традыцыйная духоўная культура** | 4 | Вераванні народаў Беларусі. Магічныя абрады. Гаспадарчая, лячэбная, любоўная і шкоданосная магія. Замовы.Вусная народная творчасць.<br>Беларускі народны каляндар. Анекдоты, жарты, досціпы.<br>Народная музыка. Народнае харэаграфічнае майстэрства.<br>Народны тэатр. Батлейка. | Аналіз літаратуры, складанне канспекта |
| | **Усяго** | **51** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне**

Час, адведзены на самастойную работу, можа выкарыстоўвацца на: падрыхтоўку да лекцый, семінарскіх заняткаў; падрыхтоўку да залікаў і экзаменаў па вучэбнай дысцыпліне; афармленне інфармацыйных і дэманстрацыйных матэрыялаў; збіранне этнаграфічных матэрыялаў.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя метады арганізацыі самастойнай работы: тэсціраванне; індывідуальныя практычныя заданні з кансультацыямі выкладчыка; падрыхтоўка дыдактычных матэрыялаў; падрыхтоўка кампутарных прэзентацый; рэфэраты па індывідуальных тэмах.

Кантроль самастойнай работы ажыццяўляецца ў выглядзе: кантрольнай работы; пісьмовай работы, тэсціравання; абмеркавання рэфератаў; індывідуальных гутарак; прадстаўлення этнаграфічных матэрыялаў.

**Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі**

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый.

Вусная форма:гутарка, даклады на семінарах,вусны залік.

Пісьмовая форма:тэсты, кантрольнае апытванне, кантрольная работа, пісьмовы залік, тэставы кантроль засваення асобных раздзелаў і тэм курса, ацэньванне на аснове рэйтынгавай сістэмы.

Вусна-пісьмовая форма: справаздача па аўдыторным практыкаванням з іх вуснай абаронай; справаздача па практыкаванням, выкананым у працэсе самастойнага вывучэння. з іх вуснай абаронай; залік; ацэньванне на аснове рэйтынгавай сістэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, распрацаваўшай вучэбную праграму (з вызначэннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыка-культурная спадчына Беларусі | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Тэма “Гісторыка-культурная спадчына, яе ахова і выкарыстанне» разглядаецца не поўна, яна больш падрабязна вывучаецца ў вучэбнай дысцыпліне “Гісторыка-культурная спадчына Беларусі” | Пратакол № 9 ад 28.03.2017 г. |
| Гісторыяграфія гісторыі | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Тэма: “Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі» разглядаецца не поўна, яна больш падрабязна вывучаецца ў вучэбнай дысцыпліне “Гісторыяграфія гісторыі.” | Пратакол № 9 ад 28.03.2017 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ